■ Профі

# НА ВАРОТАХ СТАЛІЦЫ: у справе — міліцыя на транспарце

**Са з'яўленнем чыгункі аднымі з самых прыгожых і сучасных аб'ектаў у гарадах, праз якія яна праходзіла, сталі вакзалы. І гэта не дзіўна, бо яны выконвалі ролю візітнай карткі населенага пункта: менавіта з вакзала пачыналася знаёмства з горадам прыезджых з іншых мясцін краіны і з-за мяжы. Тут заўсёды вiравала жыццё: латочнікі, рамізнікі, насільшчыкі... З цягам часу гэтыя прафесіі трансфармаваліся або наогул зніклі, а вось мітусня засталася. Сачыць за парадкам у такой атмасферы — задача складаная, аднак амаль за стагадовую гісторыю існавання транспартнай міліцыі ўдалося навучыцца паспяхова з ёй спраўляцца.**



У абавязкі супрацоўнікаў гэтага падраздзялення сталічнай міліцыі ўваходзіць забеспячэнне грамадскага парадку на ўсіх аб'ектах чыгуначнага транспарту ў адміністрацыйных межах Мінска, а таксама ў рухомым саставе, у тым ліку і на тэрыторыі ўсёй Мінскай вобласці. Пералік задач немаленькі, ды і сама праца напружаная. Гэта становіцца зразумелым ужо пасля некалькіх хвілін знаходжання ў аддзяленні міліцыі, якое размяшчаецца побач з вядомай шматлікім турыстам прывакзальнай гасцініцай. Штохвілінныя званкі, разгубленыя заяўнікі, маўклівыя правапарушальнікі... Сапраўды, работа тут кіпіць.

Як расказаў **намеснік камандзіра роты ППСМ мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце маёр міліцыі Андрэй ХРАЛОВІЧ,** супрацоўнікі патрульна-паставой службы міліцыі дзяжураць на тэрыторыі вакзала 24 гадзіны ў суткі сем дзён на тыдзень. Акрамя таго, ім дапамагаюць прадстаўнікі АМАПа і вайсковыя нарады. Адначасова на тэрыторыі вакзала разгрупаваныя тры патрульныя нарады, два нарады АМАПа і восем нарадаў унутраных войскаў. Да таго ж па ўсім перыметры ўстаноўлена больш за 200 камер, за якімі бесперапынна сочаць, так што можна адчуваць сябе ў поўнай бяспецы.

Акрамя забеспячэння грамадскага парадку, у абавязкі супрацоўнікаў міліцыі ўваходзяць папярэджанне і прафілактыка правапарушэнняў, раскрыццё і выяўленне злачынстваў, вышук і ўстанаўленне асоб, якія іх учынілі, арганізацыя барацьбы са злачыннымі замахамі на транспартныя грузы, садзейнічанне транспартным ведамствам у падтрыманні бяспекі падчас руху цягнікоў. Пасля абвастрэння міграцыйнага становішча ў свеце, а таксама ўвядзення ў дзеянне ўказа аб бязвізавым парадку ўезду і выезду на тэрыторыю Беларусі на пяць дзён асабліва актуальнай стала задача кантролю за рэжымам знаходжання ў нашай дзяржаве замежных грамадзян і асоб без грамадзянства. Аднак, па словах Андрэя Храловіча, ніякіх дадатковых праблем, звязаных з павелічэннем узроўню злачыннасці, не ўзнікла.

У сярэднім у дзень складаецца каля 25—30 пратаколаў, звязаных з усімі тыпамі злачынстваў і правапарушэнняў, аднак часцей за ўсё яны не носяць сістэмнага характару. Найбольшая «актыўнасць» назіраецца ў выхадныя, святочныя і перадсвяточныя дні. Акрамя таго, з павелічэннем пасажырапатоку ў так званы дачны сезон праблемных сітуацый становіцца больш.

Самым распаўсюджаным злачынствам з'яўляюцца крадзяжы, якія ў большасці выпадкаў адбываюцца з-за няўважлівасці пасажыраў. Пакінуў рэчы на некалькі хвілін без нагляду, заснуў ці нават забыўся — і чамадана як не было. Нягледзячы на службовыя абавязкі міліцыі, не варта забываць і аб асабістай адказнасці, усё ж вакзал — гэта не тое месца, дзе можна дазволіць сабе расслабіцца. Калі рэчы ў вас усё ж такі прапалі, не варта марнаваць час на бескарысныя самастойныя пошукі злачынца, як найхутчэй варта звярнуцца да супрацоўнікаў міліцыі.

Яшчэ два распаўсюджаныя правапарушэнні, якія грамадзяне гэтым разам здзяйсняюць не з мэтай атрымання прыбытку, а з-за уласнай бязладнасці, — гэта курэнне ў неналежным месцы і пераход чыгуначных пуцей зноў жа не там, дзе трэба. Як патлумачыў **начальнік мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце палкоўнік міліцыі Аляксандр МІНЬКО,** згодна з артыкулам 17.9 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях курэнне (спажыванне) тытунёвых вырабаў у месцах, дзе яно ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі забаронена, цягне накладанне штрафу ў памеры да чатырох базавых велічынь. Калі першы час пасля з'яўлення ўстаноўленых месцаў для курэння якія-небудзь заўвагі ў адрас курцоў выклікалі ў іх толькі здзіўленне, то цяпер большасць з іх ужо ведаюць пра тое, што, умоўна кажучы, нельга выходзіць за намаляваную на тратуары рысу. Тым не менш усё яшчэ сустракаюцца тыя, хто дэманстратыўна, нягледзячы на разумныя довады аб пасіўных курцах, якія не жадаюць быць датычнымі да іх залежнасцяў, адмаўляецца хоць у чым-небудзь сябе абмяжоўваць. Летась прадстаўнікамі мінскай транспартнай міліцыі на такіх было складзена 1232 пратаколы.

Аляксандр Мінько ўдакладніў, што згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта №28 курэнне (спажыванне) тытунёвых вырабаў забараняецца, за выключэннем месцаў, спецыяльна прызначаных для гэтай мэты, у тым ліку на ўсіх відах вакзалаў, у аэрапортах, падземных пераходах, на станцыях метрапалітэна; ва ўсіх відах грамадскага транспарту, вагонах цягнікоў, на суднах, у самалётах, за выключэннем цягнікоў далёкага накіравання, пасажырскіх судоў і самалётаў, у якіх прадугледжаны спецыяльна прызначаныя для гэтага месцы.

Што датычыцца пераходу чыгуначных пуцей у неўсталяваным месцы, то гэту вобласць рэгулюе артыкул 18.3 пункта 5 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Па словах начальніка мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце, падобнае правапарушэнне цягне накладанне штрафу ў памеры ад 0,2 да 2 базавых велічынь. Аднак грашовае спагнанне — далёка не самае страшнае наступства такой рызыкоўнай «эканоміі часу»: гэта вельмі траўманебяспечна, акрамя таго, кожны год не абыходзіцца без смяротных выпадкаў. Усяго ж летась было складзена 1305 пратаколаў, у гэтым годзе — ужо 217.

Калі параўноўваць з тым, што было яшчэ два дзесяцігоддзі таму, то абстаноўка ў цягніках і электрычках істотным чынам змянілася. Аб масавым гандлі, азартных гульнях ці дзейнасці махляроў зараз альбо не чуваць наогул, альбо гэта нейкія адзінкавыя выпадкі. Тым не менш супрацоўнікі міліцыі працягваюць выбарачна суправаджаць чыгуначныя саставы, найбольш загружаныя напрамкам надаецца асаблівая ўвага, часам міліцыянеры працуюць разам з кантралёрамі. Як і ў многіх іншых выпадках, больш за ўсё праблем узнікае з нецвярозымі грамадзянамі.

Супрацоўнікі міліцыі нагадваюць, што правілы існуюць у першую чаргу для таго, каб гарантаваць бяспеку саміх грамадзян, а прычыны парушаць іх — не прайсці лішнія 200 метраў або закурыць адразу на выхадзе з метро, а не праз дзве хвіліны — не вартыя магчымых наступстваў. ■



## Прамая лінія

**УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ ДАВЕДАЦЦА ПРА МІГРАЦЫЮ**

**У аўторак, 28 сакавіка, адбудзецца прамая тэлефонная лінія з намеснікам начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Ціханавічам ТАТУРАМ.**

**Пытанні, якія датычацца знешняй працоўнай і вымушанай міграцыі, можна задаць з 11.00 да 12.00 па тэлефоне (8-017) 218-55-30.**

■ Падрабязнасці

# СПЫНЯЦЬ НА СТАДЫІ ПАДРЫХТОЎКІ

### У сталіцы абмеркавалі метады барацьбы з інтэрнэт-педафіліяй

**Гэтай тэме быў прысвечаны міжнародны семінар, арганізаваны па ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі пры падтрымцы Інструмента тэхнічнай дапамогі Еўрапейскага саюза TAIEX.**

**У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі дзяржорганаў, якія так ці інакш сутыкаюцца з гэтай праблемай, а таксама эксперты з Іспаніі, Харватыі, Румыніі і Вялікабрытаніі.**

Удзельнікі семінара разгледзелі такія тэмы, як новыя трэнды інтэрнэт-педафіліі і сучасныя інструменты барацьбы з ёй, механізмы выяўлення злачынцаў і іх непаўналетніх ахвяр, практычныя аспекты пры расследаванні злачынстваў сексуальнага характару, супрацоўніцтва з IT-індустрыяй.

Варта адзначыць, што нядаўна з'явіліся новыя пагрозы ў інтэрнэце з боку педафілаў: абмен паведамленнямі сексуальнага характару, вымагання, шантаж, віртуальныя гульні. **Начальнік аддзела галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі Дзмітрый ЦАЮН** адзначыў, што ў многіх краінах замацавана пакаранне за грумінг — тактычны падыход дарослага чалавека да непаўналетняга з сексуальнымі мэтамі: «Мы таксама хочам дамагчыся з'яўлення такой прававой нормы, каб караць педафілаў не толькі за ўчынены гвалт над дзіцем, а ўжо на стадыі падрыхтоўкі: віртуальны кантакт, зносіны, сустрэчы».

Семінар завяршыўся дыскусіяй удзельнікаў аб перспектыўных кірунках узаемадзеяння беларускіх і замежных праваахоўных органаў у згаданай сферы. ■

■ Навіны 102

### Першая «закладка» 17-гадовай мінчанкі

**У міліцыю Фрунзенскага раёна паступіла паведамленне ад ахоўніка аднаго з банка.**

Увагу мужчыны, які знаходзіўся на рабоце, раніцай адцягнуў шум з вуліцы. Падышоўшы да акна, ён убачыў, як дзяўчына спрабуе схаваць маленькі скрутак па пад падаконнік аддзялення банка, то ў невялікую яму каля сцяны будынка. Ахоўнік тут жа выбег на вуліцу, патэлефанаваў у міліцыю і затрымаў дзяўчыну да прыезду супрацоўнікаў.

Было ўстаноўлена, што дзяўчына — непаўналетняя навучэнка аднаго з ліцэяў сталіцы, якая такім спосабам вырашыла падзарабіць. Псіхатропнае рэчыва яна атрымала з інтэрнэт-крамы. Як высветлілася, гэта была першая яе спроба стварыць схованку-закладку з псіхатропным рэчывам. Затрыманай пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да 15 гадоў.

### Укралі з кватэры больш за 3 тысячы долараў

**У сталіцы затрымалі раней судзімага 22-гадовага мінчаніна, які, вырабіўшы дублікат ключоў, пранік у кватэру па вуліцы Кальварыйскай, дзе ўкраў грашовыя сродкі ў суме 3,1 тысячы долараў.**

У міліцыю звярнулася жанчына з заявай аб крадзяжы валюты. Яны — 9 тысяч долараў — ляжалі ў сумачцы ў шафе аднаго з пакояў. Заяўніца літаральна гадзіну адсутнічала дома, а калі вярнулася, заўважыла, што ўваходныя дзверы зачынены на адзін абарот ключа. Жанчына добра памятала, што зачыняла замок на тры абароты, паведаміла ў Цэнтральным РУУС. Гэта падалося гаспадыні падазроным, яна вырашыла праверыць грошы і выявіла недахоп.

Міліцыя ўстанавіла, што іх украў 22-гадовы сужыцель пляменніцы ўладальніцы жылля. Малады чалавек ведаў пра грошы. Ён узяў ключы сына гаспадыні і зрабіў дублікат. У падазраванага канфіскавалі грошы, з якіх ён 400 долараў паспеў патраціць. Раней хлопец быў судзімы за аналагічнае злачынства.

### Двойчы вынеслі аргтэхніку з аднаго офіса

**У сталіцы затрыманыя раней судзімыя 38-гадовы мужчына і 35-гадовая жанчына, якія здзейснілі крадзеж.**

Першы раз ноччу яны пранiклі ўнутр праз акно і выкралі МФУ. Праз некалькі дзён — тэлевізар, тры маніторы, а таксама прынтар на агульную суму больш за тры тысячы рублёў. Спрабавалі выкрасці чатыры маніторы, аднак адзін з іх упаў і разбіўся, паведамілі ў Цэнтральным РУУС. Затрыманым пагражае пазбаўленне волі да чатырох гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by ■